СВАБОДА
№19 17 — 23 траўня 1994 г.
Кошт 100 рублёў

# Подпісаў не пашкадавалі. А каму аддадзім галасы?

TV ПРАГРАМА

Сем зь 19-ці прэтэндэнтаў на прэзыдэнцкую пасаду сабралі неабходную колькасьць подпісаў. Прыкладныя лічбы такія:

**В.Кебіч — больш за 400 тыс. подпісаў**
**+ 203 подпісы дэпутатаў ВС**
**З.Пазьняк — каля 230 тыс.**
**В.Новікаў — больш за 200 тыс.**
**А.Лукашэнка — 177 тыс.**
**А.Дубко — 142 тыс.**
**С.Шушкевіч — 122 тыс.**
**Г.Карпенка — каля 100 тыс.**
**+ 78 подпісаў дэпутатаў ВС**

Газэта СВАБОДА сабрала ўнікальны матар'ял: колькі за каго было пададзена подпісаў у кожным раёне Беларусі (гл. 3-ю стар.). Мы ня ўлічвалі толькі тав. Дубко, мяркуючы, што яму ня ўдасца перасягнуць 100-тысячны рубеж. Аднак наш прагноз ня спраўдзіўся — Дубко сабраў подпісы. Тым часам група Г.Карпенкі не змагла набраць 100 тысячаў. Але маладэчанскі мэр падстрахаваўся 78-мю дэпутацкімі подпісамі, што дае яму магчымасьць быць зарэгістраваным у якасьці кандыдата.

Паказальна, што ў Менску і некаторых іншых буйных прамысловых гарадох бясспрэчна лідзіруе З.Пазьняк. Прыкладам, у сталіцы ён сабраў 91 тыс. подпісаў, тым часам як Кебіч усяго 42 тыс. Вельмі характэрна, што ў Маладэчне ў Кебіча — нуль подпісаў. Гэта значыць, што там, дзе выбарчай кампаніяй прэм'ера не займаецца мясцовы дзяржаўны апарат — у Вячаслава Францавіча поўны правал.

На працягу 10 дзён выбарчыя камісіі будуць рабіць праверку падпісных лістоў. Калі ў падпісным лісьце прызнаюць несапраўдным хоць адзін подпіс — будуць скасоўваць увесь ліст.

Можна чакаць, што некаторыя кандыдаты пасьля рэгістрацыі напярэдадні выбараў здымуць свае кандыдатуры. Хутчэй за ўсё так зробіць Васіль Новікаў і, магчыма, Аляксандар Дубко. Кебіч наўрад ці дазволіць ім расьцягваць ягоныя галасы.

Але на сёньняшні дзень бадай што самае цікавае паглядзець: хто, дзе і колькі сабраў подпісаў *(глядзіце 3-ю стар)*.

**Пятро ПАНКРАТОВІЧ**

Збор подпісаў: унікальныя зьвесткі для аналізу *стар. 3*
Прыватызацыйныя чэкі: не хвалюйцеся — прапіць можна *стар. 4*
Невядомая палеская вайна *стар. 5*
Адам Глёбус пра Віктара Чыкіна *стар. 8*

## З такімі малітвамі можна і лоб разьбіць

**Праваслаўныя вернікі Кобрыня трохі разгубіліся, калі пачулі падчас службы ад свайго благачыннага пратаярэя Аляксандра Лесіка, што наступным разам трэба прыйсьці ў царкву з пашпартамі ды падпісацца за Вячаслава Кебіча.**

Але яшчэ больш зьдзівіліся вернікі, калі прачыталі 12 траўня ў «Народнай газэце» паведамленьне Эпархіяльнай управы Беларускае праваслаўнае царквы: «У цяперашняй прэзыдэнцкай гонцы праваслаўная царква, выконваючы рашэньне Сьвятарнага сыноду, будзе займаць пазыцыю пабочных назіральнікаў. Сьвятары ня маюць права праводзіць агітацыю за таго або іншага кандыдата».

Падобна, што праваслаўная царква працягвае лепшыя камуністычныя традыцыі: гаварыць адно, а рабіць — іншае.

**Мірон ГАМОН**

## Паўмільёна канвэртаў для Вячаслава Францавіча

**Карэспандэнту СВАБОДЫ стала вядома, што Міністэрства сувязі Беларусі атрымала нетрадыцыйную замову з ураду.**

Саўмін загадаў надрукаваць паўмільёна маляўнічых паштовых канвэртаў. Навошта? Рэч у тым, што тав. Кебіч вырашыў напярэдадні прэзыдэнцкіх выбараў даслаць кожнаму вэтэрану пэрсанальнае віншаваньне з нагоды 50-й гадавіны вызваленьня Беларусі ад фашыстаў. Акрамя таго, урад мяркуе падмацаваць віншавальныя словы прэм'ера грашоваю дапамогаю ўдзельнікам вайны.

Праўда, у Міністэрстве сувязі спрабавалі растлумачыць саўмінаўскім чыноўнікам, што за такі кароткі тэрмін надрукаваць канвэрты «практычна немагчыма» (друкаваць іх даводзіцца ў Расеі). Аднак пра цяжкасьці паштавікоў у Саўміне і слухаць не захацелі: «Загад ёсьць — выконвайце любой цаной».

**Васіль ЛІПСКІ**

ГОД ЗАСНАВАНЬНЯ 1902
ВЫХОДЗІЦЬ З 1990

Галоўны рэдактар
**Ігар ГЕРМЯНЧУК**

Заснавальнік **Павал ЖУК**

Выдавец
**«Газэта СВАБОДА», Ltd.**

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
**220088, Менск, вул.Іванаўская, 56**

## „Караул! В ружьё!"

**Першы этап прэзыдэнцкай кампаніі сьведчыць, што самымі надзейнымі бастыёнамі Кебіча зьяўляюцца вайсковыя часткі.**

Напрыклад, у вайсковым вучэбным цэнтры ў Печах, паблізу Барысава, 7 траўня спрабавалі зьбіраць подпісы сябры ініцыятыўнай групы С.Шушкевіча: А.Ігнаценка і Ю.Мамцаў. Як толькі яны заявіліся на КПП, дзяжурны афіцэр выклікаў узброеную варту. Прыйшоў падпалкоўнік Новік — «адказны за выбарчую кампанію» (так завецца ягоная часовая пасада). Ён паказаў загад №551, выдадзены начальнікам вучэбнага цэнтру генэралам Мінаевым, які аддаў распараджэньне безь ягонай санкцыі ніякай дзейнасьці ініцыятыўных групаў на тэрыторыі цэнтру не дапускаць. Нягледзячы на тое, што гэта ёсьць прамое парушэньне выбарчага закону, прыхільнікаў Шушкевіча не дапусьцілі да вайскоўцаў і ў другі раз — 12 траўня. Між тым за В.Кебіча тут было сабрана некалькі тысяч подпісаў.

**Мікола ГРЫНЯВІЦКІ**

## На суд — з гранатаю

**У ноч з суботы на нядзелю быў узарваны гранатаю будынак Чэрвенскага раённага суда.**

Гранату кінулі ў вакно першага паверху, дзе знаходзяцца кабінэты судовых выканаўцаў. Будынак моцна не пацярпеў, але разбурана некалькі памяшканьняў. У панядзелак суд працаваў у больш-менш нармальным рэжыме.

Падобна, што ўлады настолькі захапіліся пошукамі тэрарыстаў у газэце СВАБОДА (гл. №16), што займацца сапраўднаю пагрозаю часу няма.

**Мікола ГРЫНЯВІЦКІ**

## Сумленна працаваць — ня ўзносы зьбіраць

**Слонімскія ўлады пазбавілі ліцэнзіі на розьнічны гандаль малое прадпрыемства «Маладзёжны цэнтар».**

Гэтая камэрцыйная структура, некалі створаная пад эгідаю былога гаркаму камсамолу, пастаянна парушала правілы гандлю і падаткавага заканадаўства, не выконвала элемэнтарных патрабаваньняў санітарных службаў.

**В.В.**

Ф.СП-1

Міністэрства сувязі Беларусі
"Белсаюздрук"

АБАНЭМЭНТ на газэту 63887

СВАБОДА Колькасьць камплектаў 1

на 1994 год па месяцах:
1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Куды (паштовы індэкс) (адрас)

Каму (прозьвішча, ініцыялы)

ДАСТАВАЧНАЯ КАРТКА

ПВ Месца літар на газэту 63887

СВАБОДА

Кошт падпіскі 1500 руб. пера-адрасоўкі руб. Колькасьць камплектаў 1

на 1994 год па месяцах:
1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Куды (паштовы індэкс) (адрас)

Каму (прозьвішча, ініцыялы)

© PDF: Kamunikat.org 2010
© Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010

## Гарадзенцы праштрафіліся

**У панядзелак В.Кебіч пачаў сваю паездку па Гарадзеншчыне са Смаргонскага раёну.**

У гэты ж дзень у Лідзе павінна была адбыцца нарада з кіраўнікамі гарадоў і раёнаў вобласьці. У аўторак запланаваны візіт Кебіча ў сядзібе Саюзу палякаў Беларусі ў Горадні. Паводле папярэдніх зьвестак, ён паабяцае кіраўніцтву гэтага саюзу пабудаваць польскія школы ў выпадку, калі яго выберуць прэзыдэнтам. У суботу сядзібу СПБ ужо наведаў міністар адукацыі Гайсёнак, які таксама абяцаў стварыць польскія школы.

Магчыма, Кебіч маркуе адначасова высьветліць, чаму гарадзенцы гэтак мала сабралі за яго подпісаў — усяго 2838, у выніку чаго ён апынуўся ажно на 7-ым мейсцы.

С.А.

## Грыб любіць камфорт

**Мечыслаў Грыб актыўна карыстаецца прывілеямі, якія дае пасада Старшыні ВС.**

У прыватнасьці, ён апанаваў урадавае лецішча ў Драздах, што паблізу Менска. У гэтым асабняку плошчаю 500 кв.м. да паслугаў генэрала лазьня, басэйн, кіназаля, більярдавая заля і г.д.

Раней тут адпачывалі першыя сакратары ЦК КПБ. У часы Шушкевіча лецішча пуставала. Але, вядома, доўга так працягвацца не магло — быў бы куст, а варона знойдзецца.

Акрамя таго, Мечыслаў Іванавіч мае «запасны варыянт»: у Ждановічах ён пасьпеў збудаваць сабе шыкоўнае прыватнае лецішча.

Іван СІДАР



**Вячаслаў Кебіч удзячны Мечыславу Грыбу, што сьпікер вырашыў не перашкаджаць прэм'еру ў прэзыдэнцкай гонцы і ня выставіў сваю кандыдатуру. СВАБОДЗЕ вядома, што паплечнікі М.Грыба прапаноўвалі яму сабраць 70 дэпутацкіх подпісаў, аднак генэрал не наважыўся.**

Пікетныя нататкі

# Як мы зьбіралі подпісы

Стаім у пікеце каля ГУМа, зьбіраем подпісы за вылучэньне ў прэзыдэнты Пазьняка Зянона Станіслававіча. Цікавая гэта справа і вясёлая. У нас плякат з выявою кандыдата ў прэзыдэнты, раскладны столік, чорны «дыплямат» з тэчкамі па раёнах і брызэнтавы абадраны раскладны ўслончык — усё нашае абсталяваньне.

Я прасіў, каб ня бралі гэты несалідны рыбацкі зэдлік: пікет павінен выглядаць прадстаўніча. Але астатнія пікетнікі праігнаравалі заўвагу — паспрабуй пастаяць на нагах увесь дзень, запаўняючы падпісныя лісты. А так хоць па чарзе можна прысесьці.

Подпісаў за дзень набіраецца каля двухсот. Прыкладна яшчэ столькі ж шкадуюць, што забыліся ўдома пашпарты.

Людзі па-рознаму рэагуюць на нашага кандыдата.

Падыходзіць сівы высокі дзед-вэтэран, з планкамі над кішэняю. «Пазьняк? Толькі за Пазьняка! Я вось сам украінец і люблю сваю Украіну! А ён любіць Беларусь! І я яго за гэта паважаю!»

Праходзіць каля нас высокая, з прыгожымі доўгімі-доўгімі нагамі дзяўчына — цокае абцасамі па асфальце. Спаднічка такая кароткая, што, здаецца, яе няма. Мы аднадушна суправаджаем яе позіркамі. «Такой пры любой уладзе добра», — з павагаю жартуе адзін з нас.

Падбягае кабета ў целе з адбеленымі раскіданымі валасамі. Пытаецца, нахабна пасьміхаючыся: «А колькі ў Пазьняка было жонак?» «Ніводнай», — сумленна адказваем мы. «Ведаю я Зэніка, — адказвае яна, — сама ў акадэміі працую. Мнагажэнец ён! Мнагажэнец! І я ўсіх угаворваю, каб не галасавалі за яго!» — безапэляцыйна выказваецца яна і ляціць, матляючы крысамі расшпіленага плашча.

Падыходзіць мужык, увесь у джынсе, раскормлены, з бародкаю і вузкімі вачыма. Пасьміхаецца, гледзячы на нас і на людзей, якія ставяць подпісы. «А вы уверены, что нужно голосовать за Позняка?» «Вядома!» — адказвае жанчына, якая перад гэтым падпісала ліст. «А вы ня ўпэўнены?» — пытаюся я. «Не надо меня агитировать, — гаворыць мужык, — я Зенона хорошо знаю и сам госпремию за мову имею». Ён няпэўна круціць пальцамі ў паветры. «На здароўе», — адказваю я. Аблічча ягонае мне знаёмае, але я не магу згадаць прозьвішча гэтага «мовазнаўцы».

Нясьпешна да пікету падыходзіць невысокі капітан першага рангу ў форме, фуражцы і з ордэнскімі планкамі. «Истинный русак» і падводнік. Размаўляе з хлопцамі кароткімі і рубленымі фразамі. Усё, што зьвязана зь беларушчынай і незалежнасьцяй, яму «до фени», і ён адкрыта кажа, што хацеў бы бачыць Расею ад Берасьця да Курылаў. Ідучы на галасаваньне, ён сьведама будзе выконваць сваю гістарычную місію.

Кабета сярэдніх гадоў падпісалася за Пазьняка і з жалем гаворыць, што, на жаль, сапраўдных, чыстакроўных беларусаў на Беларусі засталося мала. «Ну гэта яшчэ як паглядзець, — супакойвае яе адзін з маіх сяброў, — Беларусь жа не была пад татарскім ярмом трыста гадоў, як, напрыклад, расейцы, і не асымілявала іншыя народы ў такой колькасьці». «Вы вельмі добра ці, наадварот, вельмі дрэнна думаеце пра беларускіх жанчын», — гульліва заявіла яна і пайшла, такім вось арыгінальным чынам паставіўшы пад сумнеў чысьціню крыві нашага народу.

Яшчэ адна кабета спачатку папрасіла паказаць нашыя пасьведчаньні, затым праверыла, ці сапраўды падпісны ліст за Пазьняка, потым доўга стаяла і не адзін раз сур'ёзна пыталася — а ці не патрапяць гэтыя сьпісы ў КДБ і ці ня будуць потым паводле гэтых сьпісаў рабіць чыстку. «Калі нас за пяць гадоў не пасадзілі, дык і зараз не павінны», — супакоілі мы яе. Яна такі прымусіла сябе падпісацца і так, усё войкаючы і сумняваючыся, пайшла далей.

Недалёка ад нас стаіць пікет за Уладзімера Карагіна. Хлопцы ў чорных акулярах сядзяць у крэслах і жуюць жуйку. Падпісваюцца ў іх мала, і яны па чарзе праводзяць наступальную тактыку — кідаюцца ў людзкую плынь, раздаюць улёткі і горача агітуюць. Але вынікі ўсё роўна невялікія. Нам з гэтым прасьцей. Людзі падыходзяць самі. Ім ня трэба тлумачыць, хто такі Пазьняк.

Падпісваюцца ў нас і вядомыя людзі. Вось падпісаўся паэт Лявон Дранько-Майсюк, вось прыляцеў радыёжурналіст Віталь Сямашка і прыцягнуў з сабой яшчэ нейкага хлопца, але, на жаль, са слуцкаю прапіскаю. Паставіў подпіс старшыня менскай арганізацыі палякаў. Падпісаўся і сам сп. Карагін, які, мабыць, рэвізаваў свае пікеты.

Падыходзіць невялікі, моцны, каржакаваты мужычок, зь якога энэргія, здаецца, так і прэ ва ўсе бакі. «Пазьняк прэзыдэнт! Тожа мне прэзыдэнт! Ды беларусы ў лапцях яшчэ 50 гадоў таму хадзілі, а ён — незалежнасьць! Ды ў мяне лысіна ў два разы большая за ягоную, — ён моцна пляскае далонёю па галаве, — я і то ня лезу! А то — прэзыдэнт!»

Падыходзіць нейкі дзядзька з ужо абпаленым пад сонцам маршчыністым тварам. Доўга паглядае на фотаздымак Пазьняка, на ягоную кепку і ўхвальна кажа: «Добра! Буду падпісвацца! Гэта наш мужык, просты, зь вёскі!»

А вось прылятае здаравяка — кашуля наросхрыст, перастуліае ад нецярпеньня нагамі, кідае на столік чатыры пашпарты, жонкі і бацькоў: «Падпісвай!» Калі адмаўляемся, кажучы, што паводле закону патрэбная іхная прысутнасьць, бурчыць незадаволена: «...законы!» А затым хутка прымае рашэньне і гучна абвяшчае: «Нічога! Я зараз іх сюды ўсіх прывяду!»

Падпісваецца кабета, якая, як гаворыць, хадзіла на ўсе сустрэчы з Пазьняком яшчэ ад 89-га году. «А дзе тут яшчэ можна за Лукашэнку падпісацца?» — пытаецца яна. Мы, разгубленыя, ня ведаем. Надта ж гэта розныя кандыдаты — Лукашэнка і Пазьняк.

Падышоў малады хлопец з адзнакаю Аб'яднанае дэмакратычнае партыі. Папытаўся, як зьбіраюцца подпісы. Сам трымае тэчку з паперамі — за Шушкевіча. Паспрабаваў зьвярнуцца да некалькіх нашых падпісанцаў, каб паставілі подпіс і яму. На дзіва, усе адмаўляюцца. Аргумант адзін — мог, не зрабіў. «Ну вось, бачыш», — кажу я яму. Ён згодна ківае галавою: «Сам ведаю». «Ну дык чаго ты?» — ківаю я на ягоную тэчку. «Партыйная дысцыпліна», — адказвае ён. А потым, каб хоць як выказаць і сваё Я супраць гэтай партыйнай дысцыпліны, ставіць свой подпіс за Пазьняка.

Падыходзіць жанчына і кажа: «За яго было б значна болей людзей, калі б ён так востра ня ставіў нацыянальнага пытаньня». Мне карціць спытаць у яе — хто яна па нацыянальнасьці. Урэшце яна агаворваецца сама — руская. Як яны ўсё ж такі баяцца нашага нацыянальнага адраджэньня.

Расьпісваецца маладая інтэлігентная кабета. Ейны сынок, год шасьці, стаіць побач і чытае: «З-бор под-пі-саў за кан-ды-да-та ў прэ-зы-дэн-ты Зя-но-на Пазь-ня-ка!» «Гэты чалавек, — кабета паказвае на Зянона, — вельмі добры, сынок. Ён зробіць так, каб нам лепей жылося». Яны адыходзяць, а затым хлопчык вяртаецца і, хоць мы аднекваемся, дае нам кожнаму па цукерцы.

**Алесь БЯЛЯЦКІ,**
**дэпутат Менскага гарадзкога савету**

*Падпіска на газэту СВАБОДА прымаецца ва ўсіх паштовых аддзяленьнях.*

*Наш падпісны індэкс 63887*

*Мы паведамляем пра тое, пра што ня піша ніхто*

СВАБОДА

## Фальшывыя ўлёткі

**У Горадні нехта распаўсюджвае фальшывыя ўлёткі, набраныя на кампутары.**

У тэксце нібы выкладаецца перадвыбарчая праграма Зянона Пазьняка. Улётку відавочна складаў нейкі невук, паколькі ў ёй пераблытаныя і рэчы сур'ёзныя і абсалютныя глупствы. Напрыклад: «Зь Беларусі выводзяцца ўсе чужаземныя войскі і ўводзяцца іншаземныя». Стыль улёткі нагадвае выступы аднаго вядомага «змагара з мафіяй». Але высьветліць гэта дакладна павінны праваахоўныя органы. Дарэчы, хоць улётка напісана нібы па-беларуску, але з мностам памылак.

В.В.



© PDF: Kamunikat.org 2010 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010

Сёньня

Сяргей ДУБАВЕЦ

## Мэнтальнасьць нацыі

Палітыкі занадта самаўпэўненыя, калі мяркуюць, што ўсё ўрэшце вырашаюць іхныя праграмы ўладкаваньня жыцьця. І праграмы, і самі палітыкі — усяго толькі велічыні вытворныя ад тае канстанты, якой ёсьць самое жыцьцё. Традыцыя, сьветапогляд, мараль народу не зьмяняюцца ані за месяц прэзыдэнцкай кампаніі, ані за чатыры гады дзейнасьці ўраду, ані нават за 70 гадоў сацыялізму. Падобна, што яны не зьмяняюцца ўвогуле. І сьветапогляд нашага статыстычнага сучасьніка гэткі ж, як і ў чалавека мінулага стагодзьдзя ці часоў сярэднявечча. Гэта погляд маці на сына, гаспадара на дабрабыт свае сям'і, хлопца на вайсковую службу й г.д. Гэта ёсьць наша прырода. З часоў Скарыны не зьмяніліся ліпа і дзік, дождж і вецер, усход і заход сонца. І сёньня, пакуль палітыкі палітыкуюць, мэнталітэт нацыі спакваля расстаўляе ўсё на свае месцы. Рассыпаюцца закінутыя дрэнажныя трубы, і канал паступова зноў становіцца рэчкай...

Актыўнае ўмяшаньне палітыкі — накачка радыкальнай ідэалёгіяй, міграцыйныя правакацыі, заканадаўчы ціск — на нейкі час дэфармуе прыроду нацыі. Але зьмяняюцца палітыкі — і ўсё вяртаецца на свае колы.

Сёньняшнія палітыкі на Беларусі інстынктыўна намацваюць гэтую адвечную прыроду, імкнучыся «падыграць» ёй. Але, пазбаўленыя, як правіла, элемэнтарных ведаў, філязофскага складу мысьленьня й адчуваньня вечнасьці, замест мэнтальнае сутнасьці, яны хапаюцца за гэтыя вось дэфармацыі — за сьляды папярэдніх актыўных умяшаньняў у прыроду нацыі. Гэтак А.Лукашэнка па-савецку атаясамлівае народ з пралетарыятам і кліча рабаваць нарабаванае ў імя знаёмага ідэалу — усеагульнай роўнасьці ў жабрацтве. В.Кебіч, чалавек больш глыбокі, кажа пра мэту свайго жыцьця — далучэньне Беларусі да Расеі. Але й гэткая, прывабная для многіх людзей ягонага пакаленьня ідэя, — толькі вынік дэфармацыі, праўда, не савецкага, а ранейшага часу — дарэвалюцыйнага, імпэрскага. Палітыка, які б найбольш адэкватна «пралічыў» прыроду нацыі й увасабляў яе ў сабе, няма. Магчыма, таму ў такой беднай на дзеячоў Беларусі так шмат кандыдатаў у прэзыдэнты.

Што да А.Лукашэнкі й В.Кебіча, то я параіў бы ім пачытаць старыя газэты, першаму — 30-х гадоў, другому — якія-небудзь губэранскія ведамасьці. Навошта зноў вынаходзіць тыя праграмы, якія некалі ўжо былі распрацаваныя прафэсійнымі ідэолягамі больш высокага рангу? Аж да дасканаласьці распрацаваныя. Да абсурду. І — увасобленыя ў жыцьцё.

Палітыку, які мысьліць сябе й сваю праграму вытворнымі ад жыцьця люду, я параіў бы прачытаць «Баркулабаўскі летапіс» і зразумець, што ідэал пакаленьня зьмяняецца разам з пакаленьнем, але заўсёды нязьменнай застаецца ўнутраная прырода нацыі. Можа быць, найлепшы палітык — толькі праваднік, які рэалізуе адвечную мэнтальнасьць у штодзённым канкрэтным жыцьці...

# Прыватызацыйныя чэкі: не хвалюйцеся — прапіць можна

Кажуць, разумны вучыцца на чужых памылках. Беларускі ўрад лічыць сябе разумным. Мы, маўляў, паглядзім на суседзяў, улічым, пралічым і адорым беларускі народ найбольш рацыянальным рашэньнем.

Але ўжо многім цяпер стала ясна: словы гэтыя для шырокага ўжытку, для тых няшчасных, хто яшчэ верыць. Людзі спрактыкаваныя аддаюць перавагу аналізу канкрэтных учынкаў. Яны наступныя.

Афіцыйная прыватызацыя пачалася значна пазьней за неафіцыйную. Апошняя ідзе гады з тры, і даволі пасьпяхова. Паводле словаў высокапастаўленага супрацоўніка Мінгандлю, напрыклад, усе больш-менш прыстойныя прадпрыемствы грамадзкага харчаваньня Менска знайшлі сваіх гаспадароў яшчэ ў 1991—92 гг. Тое ж датычыць прыбытковых прадпрыемстваў у іншых галінах вытворчасьці. Мэханізм просты: ствараецца акцыянэрнае таварыства, ці калектыў бярэ прадпрыемства ў арэнду, ці робіцца народнае прадпрыемства, — варыянтаў шмат. Ільвіную долю акцыяў атрымліваюць заснавальнікі і набліжаныя да іх асобы. У час «Х» група людзей абвяшчае, што кантрольны пакет акцыяў знаходзіцца ў іхных руках. Далей ўсё ясна.

Зь 1 красавіка грамадзяне Беларусі маюць права атрымаць прыватызацыйныя чэкі. Гэта значыць, што ўжо павінны працаваць шматлікія інвэстыцыйныя фонды, ня кажучы пра адладжанасьць мэханізмаў — як заканадаўчага, так і рэалізацыйнага. На сёньня (пачатак траўня) 24 інвэстыцыйныя фонды падалі заяўкі, каб атрымаць ліцэнзіі на правядзеньне апэрацыяў з чэкамі. Але ніводзін фонд ліцэнзіі не атрымаў. У самім Міністэрстве дзяржмаёмасьці дагэтуль не распрацаванае палажэньне аб ліцэнзаваньні. Зразумела, не выпадкова.

Гэтаксама адсутнічае мэханізм абмену чэкаў на акцыі прадпрыемстваў. Да таго ж інвэстыцыйны фонд мае права набыць толькі 10% акцыяў прадпрыемства. Гэта вынікае з закону «Аб разьдзяржаўленьні і прыватызацыі». Гутарка пра набыцьцё прадпрыемства цалкам нават ня йдзе.

Такім чынам, Міністэрства дзяржмаёмасьці апынулася ў даволі казытлівай сытуацыі. З аднаго боку, трэба неяк выконваць абяцанкі таварыша Кебіча наконт «справядлівай прыватызацыі». З другога — прыватызацыя ўжо ціха-мірна прайшла, перадзел маёмасьці адбыўся і новыя ўласьнікі ўжо ёсьць. Пра гэта, дарэчы, публічна заявіў старшыня Кантрольнай палаты: маўляў, грамадзянам застануцца рэшткі з панскага стала, спадзявацца няма на што.

Зрэшты, грамадзяне гэта і самі добра ведаюць: на 15 красавіка атрымана толькі 2123 сэртыфікаты (нешта кшталту ашчаднай кніжкі, дзе запісваецца колькасьць вашых чэкаў). Кошт чэка нязьменны — 25 тысяч рублёў. Адначасова Саўмін забараніў правядзеньне чэкавых аўкцыёнаў з мэтай абараніць чэкі ад поўнае «падзежы». Калі правесьці аўкцыён у такіх умовах, то адразу высьветліцца, што чэк мае вельмі нізкую рынкавую вартасьць.

Абарачэньне чэкаў мяркуецца пачаць зь 1 ліпеня — адразу пасьля завяршэньня кампаніі выбараў прэзыдэнта. Да гэтага часу чэкі можна толькі скупляць, але як гэта зрабіць, калі няма ліцэнзіі — невядома. Як увогуле весьці нейкія апэрацыі з чэкамі, калі забароненыя аўкцыёны і немагчыма вызначыць вартасьць чэка — невядома таксама.

Сярод беларускіх бізнэсмэнаў папулярнае меркаваньне, што цяперашні кіраўнік Міндзяржмаёмасьці Валеры Мацюшэўскі — праціўнік прыватызацыі. Гэта не зусім так. Вораг прыватызацыі №1 сядзіць значна вышэй. Сп. Мацюшэўскі толькі выконвае ягоныя загады.

Некаторыя інвэстыцыйныя фонды ўжо распачалі рэклямныя кампаніі. Напрыклад, старшыня ўправы Першага рэспубліканскага інвэстыцыйнага фонду А.Саманкоў абяцае разьмясьціць нашыя чэкі ў акцыях сотняў прадпрыемстваў і «наварыць» нам хоць маленькі, але ўстойлівы дывідэнд. Гэта было б магчыма, але... гл. вышэй. Гэтаксама цяжка верыцца ў абяцанкі, бо дакладна ведаем, што шматлікія інтэрвію і артыкулы добра аплочаныя. Пачытаць афіцыйныя газэты — у нас усё ідзе разумна і правільна. Паводле распрацаванага пляну.

Відаць, ва ўрадзе самі разумеюць, што чарговы раз паспрабавалі нацягнуць штаны цераз галаву. Таму дазволілі рабіць з чэкамі ўсё, што пажадаеш: можна іх падараваць, ахвяраваць, абмяняць, прадаць, — спачатку ж продаж забараняўся. Праўда, прапіць нашыя чэкі крыху цяжэй за расейскія: трэба перш наведаць аддзяленьне Міндзяржмаёмасьці і патлумачыць чыноўніку, каму прадаеш. Потым можна і прапіваць. У васьмі выпадках зь дзесяці гэта будзе найбольш разумным крокам. Пра два другія выпадкі мы мяркуем распавесьці ў наступных нумарох.

**Андрэй ШАВАНДА**

## Што чакае першага прэзыдэнта Беларусі

Група экспэртаў Агенцтва гуманітарных ініцыятываў апублікавала параўнальны аналіз

**Табліца параўнальных характарыстык кандыдатаў ў дачыненьні да задачаў, якія стаяць перад краінай**

| КАНДЫДАТЫ / ЗАДАЧЫ | Шушкевіч | Пазьняк | Карпенка | Лукашэнка | Кебіч | Новікаў |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Дэсаветызацыя | можа зрабіць | будзе рабіць | можа зрабіць | не | можа, але ня будзе | не |
| Урэгуляваньне грашовага абарачэньня | можа | можа, калі даверыць спэцыялістам | можа | не | не | не |
| Дэмілітарызацыя | так | так | так | не | не | не |
| Дэнацыяналізацыя і прыватызацыя | так | так | так | не | не | не |
| Інстытуты праўнага грамадзтва | так | ? | ? | не | не | не |
| Структурная рэарганізацыя гаспадаркі | так | так | так | не | не | не |
| Зьнешнепалітычная дактрына | так | так | ? | не | так, але якая | не |
| Культурна-палітычная дактрына | ? | так | ? | не | не | не |
| Інфармацыйная інфраструктура (свабода СМІ) | так | так | ? | не | не | не |
| Беларусізацыя | так | так | ? | не | не | не |

Крыніца: *Белорусская деловая газета*

## «Тэлебачаньне і выбары»

**Кніга «Тэлебачаньне і выбары» амэрыканскіх аўтараў Элен Міцкевіч і Чарльза Фаерстоўна з уступным словам экс-прэзыдэнта ЗША Джэймса Картэра выдадзена ў Беларусі.**

Правы на выданьне атрымала Беларуская асацыяцыя недзяржаўнага тэлебачаньня (БАНТ), якая з дапамогаю незалежнага менскага выдавецтва «Тэхналёгія» выдала кнігу накладам 2000 асобнікаў. Частку накладу БАНТ бясплатна перадала супрацоўнікам дзяржаўнай тэлевізіі. Паглядзім, як яны скарыстаюць замежны досьвед.

**Максім БАРОДЗІЧ**





**У мінулыя выходныя Бабруйск наведаў з афіцыйнай пастырскай візытацыяй біскуп Казімеж Сьвёнтак. Ён правёў мірапамазаньне, а таксама першую камунію (прычасьце) некалькіх дзясяткаў хлопцаў і дзяўчатак. Усё гэта адбывалася ў касьцёле Пятра і Паўла, які быў адчынены ў Бабруйску чатыры гады таму. Храм выглядае досыць дзіўна — амаль ушчыльную да яго прыбудаваны пяціпавярховы адміністрацыйны будынак. Як быццам месца мала ў Бабруйску!**

## Першы заходнебеларускі часопіс

**Гарадзенскае аддзяленьне Беларускага фонду культуры пачало выдаваць рэгіянальны гістарычна-культурны часопіс «Сьвіцязь».**

Рэдагуе яго старшыня фонду, прафэсар Сяргей Габрусевіч. Часопіс выдаецца як квартальнік накладам 990 асобнікаў. «Сьвіцязь» задумана як выданьне, разьлічанае таксама на беларусаў Беласточчыны, Віленшчыны і нават Латвіі. Ужо дамоўлена, што частка накладу будзе распаўсюджвацца ў Беластоку. Гэта першы на Гарадзеншчыне часопіс, які зьявіўся за 50 гадоў існаваньня вобласьці.

**С.А.**

## Мільён — на сьвечкі

**Жыровіцкі манастыр і ягоная праваслаўная парафія, што знаходзяцца паблізу Слоніма, хутка адзначаць 500-годзьдзе.**

З нагоды гэтай падзеі мясцовыя ўлады выдаткавалі сьвятым айцам адзін мільён рублёў, якога хопіць хіба на сьвечкі, а таксама 3,5 гектара зямлі для гаспадарчых патрэбаў.

**Валодзя ЯНЧУК**





© PDF: Kamunikat.org 2010 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010

# Невядомая палеская вайна

## Сумны ўспамін пра згарэлых у полымі бульбашоў, што адмовіліся здацца ў палон чэкістам

**Ю.ГУРАЛЮК**

Неяк у Маскве мне заставалася да цягніка гадзіны чатыры, і я, зразумела, пайшоў на Пушкінскую плошчу. Тады масквічы яшчэ губляліся, калі востра сутыкаліся з праблемамі «пэрыфэрыі». Гадзіны дзьве я спрачаўся з двума хлопцамі з «Памяці» і двума — з «Дэмакратычнай Расеі» пра лёс Беларусі і пра тое, што яна — не Расея ці хаця б не зусім Расея.

У складаны для мяне момант, калі хлопцы перасталі спрачацца паміж сабою і разам накінуліся на мяне, даказваючы, што беларусы заўжды любілі велікаросаў, побач з намі спынілася легкавая машына. Зь яе выйшаў п'яны «благообразный» сівы вэтэран з мноствам ордэнскіх калодак на грудзёх і скіраваў проста на нас. Мусіць, мы гаманілі гучней ад іншых кампаніяў. Убачыўшы маю адзнаку зь беларускім сьцяжком, ён спытаў: «Літовец?» Калі я адказаў: «Беларус», — ягоны твар перакасіла, хаця было відаць, што гэты чалавек умее добра валодаць сабой. І ён сказаў: «Много я ваших бульбашей пострелял по бункерам после войны. Они бункер поставят, замаскируют, а что эта маскировка против собаки? Найдем бункер и гранатами его...»

Як толькі прагучала слова «бункер», я зразумеў, што ён ня хлусіць: гэта нашая назва схронаў. Акрамя таго, казаў ён тое зь нянавісьцю, хай сабе і старанна прыхаванаю. Быў на добрым падлітку, па вачох усё было відаць.

Для мяне неяк зьніклі ўсе астатнія, і я адказаў, што ў тыя часы я быў бы *зь імі*. Усе навокал маўчалі. А гэты немалы чыноўнік з сапраўднаю цікавасьцю запытаўся: «И в меня бы стрелял?» Маўляў, мы ж вас вызвалілі... Я адказаў, што страляў бы не ў яго, а ў савецкага жаўнера, што прынёс нам савецкую ўладу. Нехта з «дэмакратаў» ня вытрымаў: «Так у вас было то же самое, что и на Западной Украине?» Я пацiснуў плячыма, мне было не да яго. Справа ішла да мардабою, але стары стрымаўся. Яшчэ раз злосна паглядзеў на мяне і раптам, павярнуўшыся, хутка пайшоў да сваёй машыны разам з мужчынамі, што яго суправаджалі. Нашае кола адразу распалася, і, працягваючы спрачацца пра нешта іншае, мае былыя апанэнты толькі кідалі на мяне час ад часу крыху спалоханыя погляды. Неўзабаве сышоў з пляцу і я.

Мне было цяжка супакоіцца, і дагэтуль я чамусьці «заводжуся», калі ўспамінаю той выпадак. Але гэта — такая старонка ў душы, якая можа «завесьці» кожнага чалавека з Палесься.

Звычайна нашыя бабулі ды бацькі маўчалі пра гэта. Увогуле пра той час мала гаворыць. Можа, баяліся, што ўражанае малое пачне балбатаць пра тое абы каму, а можа й не хацелі, каб працягвалася антысавецкая традыцыя, бо хто ж хоча, каб ягонае дзіця расло ворагам улады. Але дзесь у падлеткавым узросьце кожны на Палесьсі даведваецца частку праўды, і гэтае часткі хапае, каб зразумець сваіх бацькоў і пачаць гэтак жа ўпотайкі ненавідзець гэтую ўладу.

І я гадоў зь 15-ці ведаў праўду пра пасьляваенных «бандытаў». Нават у дзіцячым і падлеткавым фальклёры абавязкова быў прысутны чалавек са зброяй, што жыве ў лесе і дагэтуль, бывае, забівае бальшавікоў. Колькі пра яго існуе легендаў! Звычайна за гэтымі апавяданьнямі — праўда. Напрыклад, пра таго ж Бушылу, што выйшаў у Лунінецкім раёне зь лесу толькі тры гады таму, я ведаў яшчэ ў 83-м, ведаў і назву вёскі, і хто яму дапамагае, і хто ён сам, ледзь не дзе жыве: выпадкова пазнаёміўся зь ягонымі аднавяскоўцамі ў цягніку, і тыя распавялі. Як часта ў розных кутках Берасьцейскай вобласьці я чуў, як матулі палохаюць дзетак чалавекам зь лесу, каб яны не хадзілі туды. Колькі разоў дзяды у вёсках усьміхаліся мне і адказвалі жартачкамі на пытаньне пра пасьляваенных бандытаў, каб толькі не гаварыць пра іх сур'ёзна. Колькі разоў, калі я падрос, у некалькіх простых словах сёе-тое пра іх распавядалі.

Праз гэта праходзяць тут усе. Бяда толькі, што цяжка скласьці комплексную карціну тых дзеяў, бо літаратура пра іх вельмі тэндэнцыйная з усіх бакоў, а на ўзроўні народнае памяці такую карціну не складзеш: у нас няма агульнацыянальнага падыходу да гістарычных зьяваў. Палесьсе — гэта больш-менш аднароднае поле, якое складаецца з блізкіх адна адной, але даволі замкнёных каморак: радоў (групаў крэўных сем'яў), вёсак зь невялікім навакольлем, грамадаў праваслаўных і пратэстантаў.

Апарат і вялікая частка інтэлігенцыі, асабліва гуманітарнай, — людзі прышлыя і жывуць у сваім сьвеце, амаль не перасякаючы сьвет, у якім жыве тутэйшае насельніцтва. Таму нашая інтэлігенцыя ў гарадох рэдка зьяўляецца нашай і памяць пра тыя падзеі не захоўвае. Тым больш што той рух быў зьяваю вясковаю. Акрамя таго, тыя зь інтэлігенцыі, хто праўду ведае і разумее, маўчаць, каб не абудзіць раптам памяць. Палякі ж і жыды, што лепей за ўсіх хавалі гістарычную памяць усяго рэгіёну (з-за сваёй адукацыі і пасадаў) амаль зьнішчаныя. Таму людзі ў нас ведаюць толькі ўрыўкі са сваёй гісторыі, скласьці іх у адно — справа будучыні.

Спробаў зрабіць гэта было шмат. Я бачыў сваімі вачыма вялікія рукапісы ўспамінаў тутэйшых людзей пра сваё жыцьцё, бачыў і гісторыкаў, што спрабавалі нешта зьбіраць, але пакуль зроблена мала. Сярод таго, што ўсё ж зроблена, мяне вельмі ўразіў пераклад-канспэкт аднае польскае кнігі пра АУН—УПА, якая ходзіць па руках у Столінскім раёне. Абапіраючыся на яго і некаторыя іншыя такія ж крыніцы, я паспрабую больш-менш цэласна распавесьці пра тых нашых «бандытаў».

Усё пачалося яшчэ „за польскім часам". Заходняе Палесьсе лічылася больш этнічна ўкраінскаю зонаю, і таму беларускія арганізацыі, за выняткам КПЗБ, тут амаль ня дзеілі. Украінскія ж арганізацыі посьпеху мелі няшмат, але 60 школаў на тэрыторыі сучаснай Берасьцейскай вобласьці ў 1940 г. утварылі. На поўдзень украінізацыя была мацнейшая. Галоўнае ж, што асноўная палітычная апазыцыйная сіла ў той момант на Палесьсі была праўкраінская. Саветы ў нас перад вайной шмат нарабіць не пасьпелі, бо займаліся больш палякамі, і таму пэўныя ўкраінскія структуры захаваліся.

З пачаткам вайны на Палесьсе насунулася вялізная хваля «акружэнцаў» і «ўсходнікаў» — апаратчыкаў, што хацелі тут адседзецца і разгарнуць партызанку. Пачаліся рабаўніцтвы й забойствы. Немцы Палесьсе абышлі з поўначы й поўдня ды пайшлі далей. Мужыкоў у армію шмат пабраць не пасьпелі, таму было каму абараняць свае вёскі ад здэмаралізаваных «чырвонаармейцаў» і былых НКВДыстаў. Паўсюдна сталі ўзьнікаць стыхійныя ўзброеныя групы самаахновы зь мясцовых сялянаў. Часам яны дасягалі колькасьці 100—300 чалавек, як у сучасным Камень-Кашырскім раёне Ўкраіны. Немцы таго чакалі. Лезьці ў нашую дрыгву ды багну не жадалі, і таму далі магчымасьць некаторым атаманам такіх аддзелаў вольна чысьціць ад бальшавікоў свае землі. Нават зброю часам давалі.

Самы вядомы з такіх атаманаў — Максім Боровэць (псэўданім — Тарас Бульба). Ён утварыў цэлую рэспубліку са сталіцай у Алэўську (побач з Оўручам на Ўкраінскім Палесьсі), а аддзелы, што ўваходзілі ў ягоную «Поліську січ», за кароткі час распаўсюдзіліся па ўсім Палесьсі. Ён мясцовы, даволі левы праўкраінскі дзяяч; як мясцовы, не любіў львавянаў, у прыватнасьці, Бандэру зь ягонай Арганізацыяй Украінскіх Нацыяналістаў (АУН).

Бандэра ж ішоў тым самым шляхам. Заняўшы разам зь немцамі Львоў, ён утварыў свой урад і абвясьціў аб адраджэньні ўкраінскае дзяржавы. Гэты ўрад адразу атрымаў каласальную падтрымку ўкраінцаў-галічанаў, асабліва сялянаў, што ненавідзелі Саветы і палякаў даўно і па-ўкраінску апантана. Рост уплыву сБандэры напалохаў немцаў, і ўжо 11 ліпеня 1941 году яны той урад разагналі, а самога Бандэру заарыштавалі і адправілі ў канцлягер Заксэнхаўзэн сядзець разам з галоўным камандзерам Арміі Краёвай (АК была асноўным ворагам бандэраўцаў) генэралам Стэфанам Равецкім, камандзерам румынскай «Жалезнай Гвардыі» Горыа Сіма, кіраўніком германскай эвангельскай царквы Марцінам Нэмолерам, галавою нямецкіх камуністых Эрнстам Тэльманам і сынам Сталіна Якавам Джугашвілі. Выйшаў ён адтуль толькі ў сярэдзіне 1944 году. Так што бандэраўцы ўсю вайну абыходзіліся без Бандэры.

Пакуль жа немцы гулялі з Бандэрам ва ўкраінскую «самостійність», частка бандэраўцаў ваявала на баку немцаў. У іхным ліку быў Раман Шухэвыч, што ўзначальваў сфармаваны ў Германіі яшчэ да вайны батальён СС «Nachtigal». У ліпені немцы накіравалі «Nachtigal» ва ўсходнюю Ўкраіну, а потым перафармавалі яго ў «Курэнь імя Канавальца» і паслалі на ўсходнюю Беларусь весьці барацьбу з савецкімі партызанамі. Гэта пра ягоную дзейнасьць шмат пісаў Алесь Адамовіч. Курэнь паліў вёскі і лавіў рэдкіх яшчэ партызанаў. Цікава, што ўрэшце гэтыя ўкраінцы адмовіліся ўдзельнічаць у зьнішчэньні мірнага беларускага насельніцтва, і немцы былі вымушаныя адклікаць аддзел зь Беларусі. Да таго ж пасьля правалу Бандэравай справы батальён стаў ненадзейным. Шухэвыч вярнуўся ў Львоў і неўзабаве сышоў адтуль са сваімі ўзброенымі паплечнікамі на Палесьсе, дзе яны вырашылі ўтварыць першы партызанскі фронт супраць усіх ворагаў украінскай нацыі.

Максім Боровэць пасьля арышту Бандэры таксама зьмяніў арыентацыю: адмовіўся служыць немцам, фармальна распусьціў свае аддзелы, а потым сышоў у лясы і ўтварыў „Українську Повстанську Армію" (УПА). Ягоным цэнтрам цяпер было мястэчка Колкі ля Каменя-Кашырскага. Як і ранейшая «Поліська Січ», УПА Тараса Бульбы ўсяго Палесься не ахоплівала, але мела на тое прэтэнзіі. На большай частцы Палесься дзейнічалі ўсё тыя ж стыхійныя мясцовыя фармаваньні, якія ня дужа афішаваліся і часьцей проста забівалі чужых ля сваіх вёсак. Дарэчы, акружэнцы й камуністы лічылі за лепшае здацца ў палон немцам, чым жыць на Палесьсі, і неўзабаве іх тут амаль не засталося.

Калі 14 кастрычніка 1941 году на Палесьсі зьявіліся першыя ўзброеныя бандэраўцы, бульбашы іх сустрэлі ня лепшым чынам, бо сур'ёзна ваяваць за ўкраінскую ідэю не хацелі. Потым галічанаў станавілася ўсё болей, прыйшоў Шухэвыч (псэўданімы — Тарас Чупрынка, Тур і інш.), пайшлі крывавыя сутычкі, і, урэшце, узмацніўшыся, галічане-бандэраўцы ў 1943 годзе прымусілі бульбашоў, як і іншыя стыхійныя фармаваньні, канчаткова прыяднацца да іх. Тых жа, хто адмовіўся, — зьнішчалі. Цікава, што бандэраўцы таксама назваліся УПА, і пэўны час на Палесьсі было дзьве УПА. Толькі ў пачатку 1942 г. Бульба ўзяў сабе новую назву — Украінская Нацыянальна-Рэвалюцыйная Армія (УНРА). Больш-менш шчыльнае прыяднаньне бульбашоў да УПА Шухэвыча стала магчымым толькі пасьля таго, як Бульба таямніча патрапіў у нямецкі палон, у той самы Заксэнхаўзэн, дзе яны з Бандэрам даседжвалі разам.

Хутка галічане вярнуліся ў Галічыну, бо цэнтар збройнай барацьбы УПА перамясьціўся туды. На Палесьсі, як і раней, дзейнічалі былыя бульбашы і так і ня зьнішчаныя стыхійныя «банды». Мусіць, таму ў нас на Берасьцейшчыне дагэтуль ня любяць бандэраўцаў і нядрэнна ставяцца да бульбашоў. У 1945—1946 годзе сытуацыя паўтарылася: зноў былі наплылі галічане-вуніяты, зноў былі тыя ж праблемы, і зноў яны сышлі ў Галіцыю. Пра «цеплыню» ўзаемадачыненьняў бульбашоў і бандэраўцаў сьведчыць, напрыклад, упэўненасьць палешукоў, што Бульбу здаў Шухэвыч, а Бульбаву жонку згвалцілі дванаццаць бандэраўцаў.

Дзесьці з канца 1942 году на Палесьсе пачалі насоўвацца з усходу савецкія партызаны, перш-наперш рэйдавыя брыгады Каўпака і Мядзьведзева. Пачаліся сутычкі, а потым і баі з УПА. Урэшце, у канцы 1943 г. савецкія партызаны больш-менш замацаваліся на поўнач ад лініі Ковель—Сарны, якраз на тэрыторыі сучаснай Берасьцейскай вобласьці. Хаця тут і сваіх партызанаў хапала. Пасьля вызваленьня ж у лясы ўцякла плойма народу: тых, хто неяк працаваў на немцаў, а перадусім — хто не хацеў ісьці ў савецкую армію, бо там нашых часта накіроўвалі ў штрафбаты: «Отсиделись тут дома всю войну, теперь повоюете». Толькі ў канцы 1945 году, пасьля шматлікіх абвешчаньняў аб амністыі дээртырам, людзі пакрысе пачалі выходзіць зь лясоў, але надта не сьпяшаліся.

УПА ўзмацніла сваю арганізацыйную сетку на нашай зямлі, накіравала на Берасьцейшчыну некалькі тысяч байцоў з поўдня. Аддзелы яе ў 1945—1946 гг. складалі да 800 чалавек. Але і ў гэты час далёка ня ўся барацьба з саветамі ішла ў межах УПА: большасьць тых, хто быў у лесе, надта ня думала пра ідэйнае змаганьне, проста адседжвалася і чакала амэрыканцаў. Гэта, ведама, нядобра, але зусім натуральна для насельніцтва, якое сябе ўкраінцамі асабліва не лічыла. Дарэчы, сярод пасьляваенных партызанаў было нямала былых савецкіх партызанаў. Ня ўсе выходзілі зь лесу. Найбольш вядомы тут, мусіць, галава партызанскага савецкага аддзелу да 1944 году, а пасьля нашага — у Антопальскай зоне — атаман Ярмак. Ён згарэў на адным з хутароў ля Янава ў пачатку 50-х гадоў, не жадаючы здацца сваім былым паплечнікам, а цяпер МГБістам.

Прыкладна з 1947 году стала ясна, што вайны з амэрыканцамі ня будзе і трэба неяк канчаць ваяваць у лесе.

*Працяг на стар. 6.*





© PDF: Kamunikat.org 2010 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010

# Свабода друку ў сьвеце пашыраецца, але пагроза ёй да гэтага часу існуе

**Экспэрты «Фрыдам-хаўза» знаходзяць шэраг сур'ёзных парушэньняў.**

Пасьля краху камуністычнай сыстэмы савецкага ўзору свабоды друку ва ўсім сьвеце пабольшала, хаця ў бальшыні краінаў яна знаходзіцца па-ранейшаму пад пагрозаю, заявіла вядомая арганізацыя, якая адстойвае свабоду прэсы.

3 траўня, калі ААН сьвяткавала Міжнародны дзень свабоды друку, «Фрыдам-хаўз» і «Фрыдам-форум» — два цэнтры абароны інтэлектуальнай свабоды — апублікавалі свае высновы ў дакладзе пад загалоўкам «Свабода прэсы ў сьвеце ў 1994 г.: добрыя і благія навіны».

«Свабода прэсы квітнее ў 37 працэнтах краінаў сьвету, але сур'ёзныя парушэньні зафіксаваныя сёлета ў 113 з 186 краінаў», — гаворыцца ў дакладзе «Фрыдам-хаўза». У ім таксама адзначаецца, што адзін з паказьнікаў свабоды прэсы — «колькасьць журналістаў, забітых пры выкананьні сваіх абавязкаў» — за мінулы год засталася высокай: 76 ахвяраў.

Паводле дакладу, у 68 дасьледаваных краінах прэса церпіць ад жорсткага палітычнага ўціску і запалохваньняў; частковая свабода друку забясьпечана ў 64 краінах; прэса не свабодная ў 54 дзяржавах, дзе адзначаны «высокі ўзровень дзяржаўнага кантролю над сродкамі масавай інфармацыі, які часта прымае форму фізычнага запалохваньня журналістаў».

Да краінаў, якія забясьпечваюць самую шырокую свабоду друку, аўтары дакладу адносяць: Бэльгію, Новую Зэляндыю, Аўстралію, Нарвэгію і Данію; менш за ўсіх свабодная прэса на Кубе, у Таджыкістане, Паўночнай Карэі і Бірме. «Самая несвабодная прэса ў сьвеце» — у Іране.

Злучаныя Штаты займаюць адно зь першых мейсцаў — шостае — ў сьпісе краінаў, якія валодаюць максымальнаю свабодаю друку, але «губляюць пункты» ў сувязі з тым, што астранамічныя кошты выдавецкай і перадавальнай дзейнасьці прыводзяць да таго, што асьцярожныя выдаўцы і тэлекампаніі «знаходзяцца пад уплывам рэклямы і глядацкага рэйтынгу».

Адпаведна дакладу, расейскія і ўкраінскія сродкі масавай інфармацыі адносяцца да разраду «часткова свабодных», прычым некаторыя расейскія журналісты дэманструюць «выключна высокую ступень незалежнасьці».

**Пол МАЛАМУД, USIA**

# Колькі каштуе народны артыст?

**У беларускім «правіцяльстве» слухаюць хіба толькі рамансы, якія сьпяваюць фінансы. А вось да сьпеваў народных куміраў яно застаецца глухім.**

У нашай краіне 55 народных артыстаў Беларусі, якія за сваё высокае званьне атрымоўваюць толькі 250 рублёў у месяц, чаго хапае, каб набыць чатыры пушкі запалак. Як паведамілі карэспандэнту СВАБОДЫ ў Міністэрстве культуры й друку, ужо год марна доўжыцца хадайніцтва перад урадам, каб падвысіць кошт званьня «народны» да 5—6 мінімальных зарплатаў. Улічваючы арыентацыю беларускай верхавіны, здавалася б, народныя артысты СССР (а іх у нас 14) павінны атрымоўваць больш. Але і яны маюць такую самую даплату, як і народныя артысты Беларусі.

Чыноўнікі дабіваюцца справядлівасьці толькі ў дачыненьні да народных, бо іх меней. Заслужаныя артысты Беларусі атрымоўваюць у месяц за званьне 150 рублёў, чаго не хапае нават на адну паездку ў грамадзкім транспарце. Аказваецца, Саўмін бядуе, што заслужаных у нашай краіне ажно 184, і калі ім падвышаць, то фінансы тыя завыюць. Тым больш, калі падвысіць заслужаным артыстам, то пацягнуць руку і заслужаныя настаўнікі, і іншыя.

**Алесь ДАШЧЫНСКІ**

**Цэны квіткоў у опэрных тэатрах сьвету (у далярах ЗША)**

| Дзяржава | Горад, тэатар | Найтаньнейшы квіток | Найдаражэйшы квіток | Колькасьць месцаў |
|---|---|---|---|---|
| Аўстрыя | Вена, Дзяржаўная опэра | 1,7 | 173 | 2280 |
| Нямеччына | Бэрлін, Нямецкая опэра | 9,7 | 75,8 | 1774 |
| Англія | Лёндан, каралеўская опэра Ковэнт Гардэн | 28,2 | 201,4 | 2061 |
| Францыя | Парыж, Опэра «Бастылія» | 10,4 | 98,7 | 2703 |
| | Опэра «Гарньe» | 10,4 | 107,3 | 1984 |
| Італія | Мілян, Ля-Скаля | 16,3 | 212 | 2061 |
| Швайцарыя | Жэнэва, Вялікі тэатар | 13,8 | 65,7 | 1462 |
| | Брусэль, Каралеўскі тэатар Ля-Монье | 7,4 | 82,4 | 1107 |
| ЗША | Нью-Ёрк, Мэтраполітан Опэра | 13 | 130 | 3375 |
| Расея | Масква, Вялікі тэатар | 0,11 | 60 | 2200 |
| | Санкт-Пецярбург Марынскі тэатар | 0,4 | 40 | 1650 |
| Беларусь | Менск, Вялікі тэатар | 0,17 | 0,58 | 1137 |
| Эстонія | Талін, Тэатар «Эстонія» | 0,07 | 2,7 | 695 |
| Літва | Вільня, Тэатар опэры і балету | 0,62 | 6,2 | 1132 |

# Канфлікт з «Известиями» перарастае ў міжнародны скандал

**Газэта «Известия» зьвярнулася ў Судовую палату па інфармацыйных спрэчках пры Прэзыдэнце РФ з выпадку адмовы беларускім МЗС акрэдытаваць у Ме́нску ўласнага карэспандэнта газэты Аляксандра Старыкевіча.**

Чакаюць, што палата разгледзіць зварот «Известий» на паседжаньні ў гэтым месяцы.

Тымчасам група беларускіх журналістаў падпісала заяву пра перасьлед уласнага карэспандэнта расейскай газэты. «Зьнешнепалітычнае ведамства Беларусі ўзяло на сябе ганебную ролю палітычнага цэнзара, — адзначаецца ў дакуманце. — Дзеяньні ў дачыненьні да Аляксандра Старыкевіча супярэчаць закону аб друку, міжнародным абавязкам што да правоў чалавека і камунікацыяў, узятых на сябе Беларусяй». Журналісты выказалі салідарнасьць са сваім калегам і надзею, што «ў беларускіх уладаў стане розуму ня ганьбіць сваю краіну і даць магчымасьць Аляксандру Старыкевічу бесьперашкодна выконваць свае прафэсійныя абавязкі».

*СІМ*

# У Польшчы будзе менш нулёў

**Эканамічны камітэт ураду Польшчы распрацаваў і прапанаваў на зацьверджаньне Рады Міністраў праект дэнамінацыі польскага злотага.**

Зь 1 студзеня 1995 г. на польскіх грошах павінна быць прыбрана чатыры нулі. Наміналы коштаў ды заробкаў скароцяцца на 10 тысячаў. Так, даляр, да прыкладу, будзе каштаваць не 23.200 злотых (як сёньня), а 2 злотыя 32 грашы, хлеб — 60 грошаў, найлепшыя польскія цыгарэты — 68 грошаў, а штодзённая газэта — 50 грошаў. Сярэдні заробак, які цяпер складае 5 000 000 злотых, будзе роўны 500 зл.

Гэта значыць, што зноў у абарачэньне вяртаюцца манэты (грошы), якія пры тысячных коштах зусім згубілі былі сваю функцыянальнасьць. Урад дакляруе: «Страты назапашаньняў быць ня можа. Дэнамінацыя — чыста тэхнічная працэдура». Яшчэ два гады новыя й старыя польскія купюры будуць мець аднолькавае хаджэньне, кошты ў крамах будуць пазначацца аднaчасова ў старых і новых наміналах. Можна будзе абмяняць любую наяўную суму, але толькі ў дзяржаўных банках. Акцыя польскага ўраду прывядзе да спрашчэньня фінансавых разьлікаў, асабліва пры буйных сумах (дзяржаўны бюджэт, банкаўскія дэпазыты і г.д.), зьменшыць верагоднасьць памылак пры падліках для спажыўца.

Усе гэтыя праблемы актуальныя й для нас. Наміналамі беларускі рубель ужо даганяе цяперашні польскі злоты. Тым больш што сп. Кебіч падараваў нам яшчэ адзін нулік. І цяпер толькі на Беларусі магчымая сытуацыя, калі ў адказ на пытаньне «Колькі каштуе?» гандлярка адказвае: «Пяць тысячаў», а вы даяце ёй купюру зь лічбаю 500, і яна ня мае нічога супроць.

**Ян ГРЭЧЫЦ**

# НЕВЯДОМАЯ ПАЛЕСКАЯ ВАЙНА

*Пачатак на стар. 5*

УПА слабела, як і ўвесь рух, і ў 1948—1949 гг. яна арганізавана перавяла свае структуры са стану партызанскай вайны да стану ўзброенага падпольля. Апошнім рэгіёнам, дзе адбыўся такі арганізаваны пераход, было Палесьсе. Сам Шухэвыч загінуў у 1950 годзе пры сутычцы з гэбістамі ў Прыкарпацьці. Ён быў нязьменным галавою УПА. Бандэру забілі ў Заходняй Германіі ў 1957 годзе. Максім Боровэць (Бульба) памёр сваёй сьмерцю ў 80-х гадох на Захадзе, пасьпеўшы напісаць вялікія мэмуары. Пасьля 1949 г. існавалі толькі маленькія стыхійныя ўзброеныя групкі. Іх было шмат. Яны дацягнулі да нашага часу, калі Бушылу лічыць адным зь іхных удзельнікаў. Калектывізацыя з-за ўсіх гэтых падзеяў пачалася на Палесьсі толькі ў канцы 1946 году, прычым ішла досыць спакойна, нават гуманна для саветаў.

Калі сыходзіць з таго, што савецкая ўлада — людажэрская, дык ейны адносна спакойны характар на Палесьсі пасьля вайны можна лічыць наступствам нашага супраціву. Мы — адстраляліся. І таму Палесьсе магло дазволіць сабе і цяпліцы, і баптызм, і моцныя традыцыі, і «сельскагаспадарчую спэцыялізацыю грамадзкай вытворчасьці». Толькі мэліярацыю вялі шмат дзе дрэнна, але не нагэтулькі, каб з-за гэтага ваяваць. Галоўнае ж, што антысавецкі ўзброены рух выратаваў душы палешукоў ад ганьбы й комплексу непаўнавартасьці.

Мы адстраляліся ад саветаў. І раз палешукі цяпер — частка беларусаў, дык гэта значыць — частка беларусаў адстралялася. А тое, што вонкава былі ўзьнятыя ўкраінскія штандары, толькі лучыць нас з украінцамі крывёю, якую разам пралілі супраць агульнага ворага. І потым, штандар сёньня адзін, заўтра — другі; вунь Шухэвыч колькі разоў яго мяняў, ці палякі. Галоўнае — за што ваявалі па сутнасьці. Мы — за сябе, хай і думалі, можа, дасягнуць гэтага ў межах „самостійноі України".

Апошняя тэза зьяўляецца, мусіць, галоўным парогам, што замінае дасьледаваць праўду пра тыя падзеі. У Луцку ў 1988 годзе апазыцыя выпусьціла брашуру, дзе Бульба названы раскольнікам. У нас — безупынна ганяць УПА камуністы. А палешукі і не адчуваюць асаблівае спрычыненасьці менавіта да УПА, бо яна ж была ўкраінскаю, а мы — беларусы. Проста памятаюць нашыя людзі звычайную праўду. Кожны памятае сваё.

Памяць абрастае легендамі. Тыя, хто бачылі, паміраюць, не пасьпеўшы і ня здолеўшы запісаць. Цямнее сьвятло над гэтаю старонкаю нашае гісторыі. Але я абавязкова распавяду свайму сыну, што ў пачатку 50-х на поўнач ад Янава, здаецца, ля Бярозы, МГБ накрыла сходку галоваў маленькіх аддзелаў, якія дзейнічалі ў навакольлі. Хутар быў абкладзены двума коламі гэбістаў. Але камандзеры не здаліся. Хату падпалілі, і яны згарэлі разам з сувязной са Львова. Потым недалёка адтуль гэтаксама згарэў Ярмак. А Бушыла выйшаў толькі нядаўна.

Хай тое напалову легенда — гэта трэба ведаць. Каб ніхто не сказаў нам: беларусы завуцца *бульбашамі*, бо ядуць бульбу. Лягерная мянушка маіх землякоў ня менш, чым палачанскае імя крывічы, адчыняе нам дзьверы ў праўду беларускае гісторыі.

**Праграма 8-га каналу з 17 па 22 траўня**

**Аўторак, 17 траўня**
18.00 Для дзяцей: «Карусэль».
18.25 Муз. праграма.
18.50 Студыя "ИНТЕКС", Навіны
19.00 «Лябірынт правасудзьдзя».
20.00 Мультсэрыял «Вальтрон».
20.30 Тэлесэрыял «Марэна Кляра». 7 сэрыя.
21.15 Давайце патаньчым...
21.45 Крывавае стварэньне. Маст.фільм

**Серада, 18 траўня**
18.00 Для дзяцей: «Карусэль».
18.25 Муз. праграма.
18.50 Журфак БДУ прэзэнтуе...
19.00 «Хіл-стрыт Блюз».
19.45 Навіны.
20.00 Мультсэрыял «Вальтрон».
20.30 Тэлесэрыял «Марэна Кляра». 8 сэрыя.
21.20 «Мілавіца».
21.45 Клясыка кінэматографу. «Закон ёсьць закон». Маст. фільм.

**Чацьвер, 19 траўня**
18.00 Для дзяцей: «Карусэль».
18.20 «Часопіс падарожжаў»: Аўстралія, Англія.
19.00 «Лябірынт правасудзьдзя».
20.00 Мультсэрыял «Вальтрон».
20.30 Тэлесэрыял «Марэна Кляра». 9 сэрыя.
21.20 ММ4 прэзэнтуе: «Навіны».
21.35 «Файт». Кікбоксынг.
21.55 «Сьмяротныя ўдары Шао Ліня». Маст. фільм.

**Пятніца, 20 траўня**
18.00 Для дзяцей: «Карусэль».
18.25 Муз. праграма.
18.50 «Солтэк» прэзэнтуе: «Дорэміфасолькі».
19.00 «Лябірынт правасудзьдзя».
20.00 Мультсэрыял «Вальтрон».
20.30 Тэлесэрыял «Марэна Кляра». 10 сэрыя.
21.20 Час мясцовы.
21.45 «Нордэн». Маст. фільм.

**Субота, 21 траўня**
15.00 Мультсэрыял «Трансформэры». 6—7 сэрыі.
16.00 «Роздумы пра джаз».
16.50 Сямейны экран. «Жыцьцё ў ліміце». Маст. фільм.
18.00 Бізнэс-плян.
19.00 «Затока Небясьпечная».
19.30 «Давайце патанчым». Муз. праграма.
20.00 Праграма мультфільмаў.
20.30 «Зорныя дзеці». З цыклю «Спадарыня ўдача».
21.00 «Солтэк» прэзэнтуе: «Спартовая мазаіка».
21.30 Сем хвілінаў з «Хрыстафорам».
21.40 Тэлесэрыял «Кветка жарсьці». 6—7 сэрыі.

**Нядзеля, 22 траўня**
15.00 Мультсэрыял «Трансформэры». 8—9 сэрыі.
16.10 Спартовая паралель.
17.00 Нямецкая хваля.
17.30 Кароткамэтражны фільм «Ускосныя доказы».
18.00 «Солтэк» прэзэнтуе: «Тэлефэн», «Вуліца».
18.30 «Дзікая Амэрыка».
19.00 «Зорныя дзеці». З цыклю «Спадарыня ўдача».
19.30 Спорт-сакрэт.
20.00 Камэдыйнае шоў «Схаваная камэра».
20.20 Тэлесэрыял «Кветка жарсьці». 8—10 сэрыі.
22.40 «Foxy Music». Муз. праграма.



© PDF: Kamunikat.org 2010 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010

